# Аўтар партрэтаў нацыянальных герояў адзначыў юбілей



31 студзеня адзначыў 75-годдзе вядомы мастак Мікола Купава. Юбілею знакамітага графіка прысвечана кніжная выстава ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. На ёй сабраны перыядычныя выданні і кнігі, дзе можна пазнаёміцца з дзейнасцю графіка і грамадскага дзеяча, прадстаўлены ілюстрацыі мастака да розных выданняў, яго цыкл прац, прысвечаных Якубу Коласу, паштоўкі з выявамі гарадоў, ілюстрацыі казак.

М. Купава стварыў цэлы шэраг партрэтаў знакавых гістарычных асобаў: гетмана Канстанціна Астрожскага, вялікага князя Альгерда, Кастуся Каліноўскага, аздобіў творы Цёткі, Каруся Каганца, Вінцэся Каратынскага і іншых.

Мікола Купава нарадзіўся ў Оршы 31 студзеня 1946 года. Мастак плённа працуе на працягу 50 гадоў у галіне кніжнай і станковай графікі, акварэлі, экслібрыса, стварае мастацкія вобразы на аснове літаратурных твораў, выканаў аздабленне звыш 30-ці кніжак і альбомаў. Ён з'яўляецца сябрам Беларускага саюза мастакоў з 1978 года і сябрам суполкі "Пагоня", даследуе архітэктуру, у прыватнасці, аршанскае абарончае сакральнае дойлідства. М. Купава браў удзел у больш як 90 нацыянальных, персанальных і міжнародных выставах, арганізоўваў шматлікія пленэры і імпрэзы.

Спадар Мікола быў узнагароджаны дыпломам і медалём Ф. Скарыны за ілюстрацыі да энцыклапедычнага выдання "Ф. Скарына і яго час" (1988), стаў пераможцам конкурсу "Вечныя гарады". Мастак вывучаў партрэт першадрукара і пакінуў свае разважанні пра яго на старонках часопіса "Наша вера" (№ 3, 2017 г).

Творы мастака захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, дзяржаўных літаратурных музеях Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа і іншых установах, а таксама ў прыватных калекцыях. Пра месца М. Купавы ў мастацкім працэсе Беларусі напісаў у кнізе "Сучасная беларуская графіка" Віктар Шматаў.

Мікалай Мікалаевіч памятае, як у 1990 годзе ў Полацку Уладыка Філарэт урачыста асвяціў бел-чырвона-белы сцяг, які праз год стаў дзяржаўным. У 1991 годзе Мікола Купава стварыў эталон дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.







- За нашым сцягам - стагоддзі гісторыі, - падкрэслівае мастак. - Упершыню бел-чырвона-белы сцяг з'явіўся на гравюры 1444 года. На той гравюры - бітва з туркамі пад Варнай, у якой таксама ўдзельнічалі войскі ВКЛ. Бел-чырвона-белыя сцягі паказаныя на славутай карціне "Бітва пад Воршай 1514 года."

- Спадар Мікола прысвяціў свае творчае жыццё сцвярджэнню нашых нацыянальных святыняў, а значыць - замацаванню нас у вечнасці, - адзначаў Рыгор Сітніца на маштабнай выставе ў Палацы мастацтваў, прысвечанай 50-годдзю творчай дзейнасці Міколы Купавы.

У 2019 годзе Міколу Купаву ўзнагародзілі памятным медалём да 100-годдзя БНР. У 2020 годзе мастак перахварэў на каронавірус, ляжаў у шпіталі, акрыяў ад хваробы і працягвае працаваць.

***Эла Дзвінская,***
*фота аўтара.*